личного рода учебных и творческих задач по рисованию и другим специальным предметам [1, с. 151].

**Заключение.** Таким образом, в примерной иллюстрированной учебно-методической программе по предмету «Рисунок» на каждом этапе обучения в детской школе искусств наглядно и последовательно определены практические задания с подробным изложением содержания их задач. Постоянное, активное и целенаправленное решение учащимися конкретных задач обеспечивает накопление и развитие качественных знаний и навыков по рисунку, обуславливающих результативный переход на новый этап обучения.


1. Василевич, О. Е. Интеграция знаний основ изобразительной грамоты в системе непрерывного художественного образования / О. Е. Василевич. – Минск : Бонем, 2013. – 220 с.
2. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронны рэсурс] : 20 ліпеня 2016 г., № 413-З: прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрвеня 2016 г. : адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрвеня 2016 г. // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2023.
3. Об изменении Кодекса Республики Беларусь об образовании [Электронный ресурс] : Закон Респ. Беларусь, 14 января 2022 г., № 154-З : принят Палатой представителей 21 декабря 2021 г. : одобр. Советом Респ. 22 декабря 2021 г. // Нац. правовой Интернет-портал Респ. Беларусь. – 31 января 2022 г. – N 2/2874.
4. Рисунок. Программа для детских художественных школ и художественных отделений детских школ искусств : учеб. издание / Бел. гос. ин-т проблем культ. ; сост.: Н. М. Неродюк. – Минск : БелГИПК, 2007. – 36 с.
5. Об утверждении типовых учебных планов детских школ искусств [Электронный ресурс] : постановление Министерства Культуры Респ. Беларусь, 21 июля 2011 г., № 32 // ЭТАЛОН / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2023.
6. Типовая учебная программа детских школ искусств по учебному предмету «Рисунок» направлений деятельности «Изобразительное» и «Народное декоративно-прикладное» [Электронный ресурс] : постановление Министерства Культуры Респ. Беларусь, 9 августа 2017 г., № 50 // Нац. правовой Интернет-портал Респ. Беларусь. – 26 августа 2017 г. – N 8/32332.


## АСАБЛІВАСЦІ ПЕДАГАГІЧНАГА ПАДЫХОДУ ІЕГУДЫ ПЭНА І ТВОРЧАСЦЬ ЯГО ВУЧНЯЎ


*Л.М. Гефцер*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*


У 1897 годзе яўрэйскім мастаком І. Пэнам была заснавана Віцебская студыя, якая ў выніку стала першай мастацкай школай на тэрыторыі Беларусі. Школа зрабіла ўнёсак у развіццё яўрэйскага нацыянальнага выяўленчага мастацтва, а таксама рускага авангарда, калі мы разглядаем творчасць шматлікіх вучняў майстра, якія працавалі, ў тым ліку, і ў авангардных напрамках, і гэтыя напрамкі сталі часткай сусветнага мастацкага працэсу.

Даследаванне асаблівасцей існавання школы Пэна ў Віцебску застаецца актуальным, паколькі яна садзейнічала распаўсюджванню яўрэйскага мастацтва на беларускіх землях шляхам развіцця творчасці вучняў майстра, якія, нярэдка працуючы ў рамках нацыянальнай тэматыкі, ў той жа час, працавалі ў розных напрамках авангарда.

Мэта – выявіць асаблівасці педагагічнага падыходу І. Пэна і характэрныя рысы творчасці яго вучняў.

**Матэрыял і метады.** Матэрыяламі для артыкула паслужылі працы навукоўцаў, у якіх увага звернута да факта існавання школы Пэна як да платформы для развіцця творчасці мастакоў, якія працавалі ў рамках нацыянальнай тэмы; дзе абагульняюцца агульнавядомыя дадзеныя і акцэнтуецца ўвага на постаці І. Пэна як педагога. У аснову артыкула пакладзены апісальна-аналітычны метад даследавання.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У кантэксце дадзенай тэмы, Пэн цікавы ў большай ступені як педагог, мастак, які аб’яднаў пад сваім кіраўніцтвам маладых людзей яўрэйскага паходжання, якія жадалі навучыца працаваць у галіне выяўленчага мастацтва. Як правіла, яны імкнуліся захаваць сваю нацыянальную

самаідэнтыфікацыю, нярэдка акцэнтуючы на ёй увагу ў сваёй творчасці. Марк Шагал, выншуючы майстра з творчым юбілеем, пісаў: «Вы выхавалі вялікае пакаленне яўрэйскіх мастакоў» [цыт. па: 1, с. 11].

Можна сказаць, што фармальнага ўплыву на сваіх вядомых вучняў Пэн не аказваў, да гэтага апелююць апаненты ідэі значнасці І. Пэна для развіцця мастацтва XX стагоддзя, аднак псіхалагічная падтрымка старэйшага прафесіянала ў пачатку творчага шляху юных мастакоў з небагатага штэтла мела бясспрэчнае значэнне з пункту гледжання сацыяльнага і гістарычнага кантэксту. Як добры педагог, у першую чаргу, Пэн імкнуўся зацікавіць мастацтвам сваіх вучняў. Спачатку ён прапанаваў ім прайсці кароткі ўступны курс, а пасля яго даваў практычна поўную свабоду ў пошуку ўласнай індывідуальнасці ў творчасці.

Казаць пра І. Пэна і Віцебскую мастацкую школу ўяўляецца важным, паколькі існаванне яго школы спрыяла працэсу развіцця яўрэйскага мастацтва на беларускіх землях. Майстар папулярызаваў уласнае бачанне нацыянальнага мастацтва ў правінцыйным горадзе, але ў выніку не распрацаваў канкрэтнай мастацкай праграмы, аднак змог перадаць сваім вучням свой погляд на яўрэйскае мастацтва. Аб характэрных рысах яго творчасці Клер Ле Фоль піша наступнае: «Эстэтыка яго прац была яўрэйскай. Ён лічыў сябе “яўрэйскім мастаком”, імкнуўся развіваць і перадаваць вучням “яўрэйскі жанр”, абуджаючы ў іх свядомасць прыналежнасці да іншай культуры, якая патрабуе абароны сваёй місіі і мастацкай праграмы. Усё гэта яскрава праяўлялася ў яго мастацтве, дзе пераважалі “яўрэйскія сюжэты”, сцэны яўрэйскага побыту і прысутнічала адпаведная сімволіка» [цыт. па: 2, с. 61].

Такім чынам, майстар імкнуўся данесці важнасць прыналежнасці да яўрэйскай культуры да сваіх вучняў, акцэнтуючы ўвагу на гэтым моманце ў сваёй педагагічнай дзейнасці і творчасці. Ствараючы працы, І. Пэн ставіў перад сабой нацыянальныя задачы, выходзячы за рамкі звычайнага напісання побыту. Сур’ёзным унёскам у яўрэйскае мастацтва можна лічыць факт стварэння майстрам прац этнаграфічнага характару, дзе ён падрабязна адлюстроўваў традыцыйны ўклад жыцця яўрэяў, які быў яму добра знаёмы, а таксама факт стварэння даступных і зразумелых твораў. У выніку мастак імкнуўся да ўзняцця культурнага ўзроўню народных мас і лічыў сваёй мэтай паляпшэнне жыцця мястэчка.

Г. Казоўскі ў артыкуле «Шагал і яўрэйская мастацкая праграма ў Расіі» [3] піша пра непадзеленасць мастацтва і жыцця, а таксама пра тое, што ад духоўнага выраджэння ратуе і абараняе нацыянальнае мастацтва.

Калі казаць пра творчасць вучняў Пэна, то ў іх працах прасочваюцца наступныя рысы: амаль усе яны звярталіся да тэм, якіх у сваім мастацтве прытрымліваўся настаўнік. У бытавым і партрэтным жанрах адлюстроўвалі жыхароў яўрэйскага мястэчка, сцэны жыцця правінцыі, не пераймаючы стылістыку Пэна ў поўным аб’ёме, прытрымліваючыся прынцыпаў, характэрных для новых тэндэнцый у мастацтве таго часу.

Вучні майстра зрабілі ўнёсак у яго спадчыну: сфарміравалі ўласны падыход, адлюстроўваючы пахаванне і могілкі, звяртаючыся да асаблівасцей яўрэйскай выяўленчай традыцыі. «Шагал, магчыма, быў першым, хто звярнуўся да дадзенага сюжэту ў працы “Пахаванне” (1908), а таксама ў іншых творах (“Могілкі”, “Брама могілак”, 1917). С. Юдовін, А. Кабішчар-Якерсон, І. Мільчын адлюстроўвалі трагічныя “Пахаванне ў мястэчку”, надаючы ім сімвалічны, а часам і прарочы сэнс, як бы прадказваючы сумны канец штэтлам. Успадкаваўшы пэнаўскую тэматыку, яны трактавалі яе зусім інакш. Кантраст паміж спакоем ціхамірных пейзажаў майстра і трагічнай безвыходнасцю твораў вучняў вельмі значны» [цыт. па: 2, с. 182].

У Віцебску многія яўрэйскія мастакі выкарыстоўвалі адпаведныя тэмы і элементы нацыянальнай культуры, першапачаткова працуючы пад кіраўніцтвам Пэна

ў рэалістычнай стылістыцы. У той жа час, існаваў шэраг майстроў, якія не імкнуліся заставацца яўрэямі ў плане ўласнай самаідэнтыфікацыі і творчасці. У выніку яны звярнуліся да свядомай асіміляцыі.

Вучням майстра і яму самому было добра знаёма жыццё ў правінцыі і яны падрабязна вывучалі яго асаблівасці, што ў значнай ступені вызначыла спецыфіку іх творчасці, звязаную з існаваннем і развіццём культуры мястэчка.

У адпаведнасці з наступным узнікненнем шэрага новых мастацкіх плыняў, адбывалася адаптацыя мастакоў да стылістычных змен, ў іх з'яўляецца магчымасць рэалізацыі ідэі стварэння новага яўрэйскага мастацтва. З аднаго боку, яны рабілі ўнёсак у нацыянальную культуру праз стварэнне ілюстрацый для кніг на ідышы, а з другога, звярталіся да сучаснага мастацтва, арыентуючыся на новыя актуальныя задачы.

Паколькі мы гаворым пра школу І. Пэна і яго вучняў, таксама ўяўляецца важным звярнуць увагу на стаўленне Марка Шагала да яўрэйскай культуры. «З аднаго боку, ён усведамляў міжнародную прыроду сучаснага мастацтва, а з дрогога – ганарыўся сваім іудзействам. Марк Захаравіч не бачыў сябе ў якасці мастака, які адраджае нацыянальную культуру, хутчэй лічыў сябе яе прадаўжальнікам, не маючы патрэбы ні ў дакументах, ні ў этнаграфічных экспедыцыях, каб знаёміцца з традыцыяй, паколькі яна была ў ім самім, ён быў у яе пагружаны з самага дзяцінства. Вусная і пісьмовая палеміка, на яго думку, была бескарыснай. Толькі само мастацтва і практыка маглі даць адказ на пытане аб яўрэйскім мастацтве. Канцэпцыя нацыянальнага мастацкага руху закладзена непасрэдна ў яго творах» [цыт. па: 2, с. 174].

Яўрэйская тэма з'яўляецца найважнейшай часткай творчасці майстра і, ў адпаведнасці з яго меркаваннем, мастацтва вызначаецца самім мастаком, аднак на яго індывідуальнасць могуць аказаць уплыў нацыянальнасць і месца нараджэння.

Праблематыка яўрэйскага мастацтва з'яўляецца важным апектам гісторыі развіцця Віцебскай мастацкай школы.

**Заключэнне.** Выявіўшы асаблівасці педагагічнага падыходу І. Пэна, а таксама творчасці яго вучняў, мы адзначаем, што, згодна з агульнавядомымі дадзенымі, існаванне школы Пэна ў Віцебску садзейнічала працэсу развіцця яўрэйскага мастацтва на беларускіх землях. Дзякуючы педагагічным прынцыпам, а таксама асаблівасцям асобы майстра, школа зрабіла сур'ёзны ўнёсак у развіццё яўрэйскага нацыянальнага выяўленчага мастацтва.

1. Masterpieces of jewish art: у 3 т. / Г. Казоўскі. – Масква: Імідж, 1992. – Т. 2: Мастакі Віцебска. Іегуда Пэн і яго вучні. – 77 с.
2. Фоль Ле, К. Віцебская мастацкая школа (1897-1923) / К. Ле Фоль. – Мінск: Прапілеі, 2007. – 240 с.
3. Казоўскі, Г. Шагал і яўрэйская мастацкая праграма ў Расіі / Г. Казоўскі // Веснік яўрэйскага ўніверсітэта ў Маскве. – 1992. – № 1. – С. 83-96.

## К ВОПРОСУ ИСПОЛЬЗОВАНИЯ ИСКУССТВЕННЫХ НЕЙРОННЫХ СЕТЕЙ ПРИ ПОДГОТОВКЕ СТУДЕНТОВ ХУДОЖЕСТВЕННО-ГРАФИЧЕСКОГО ФАКУЛЬТЕТА

*Д.П. Глущук*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

Ориентиром современного художественного образования является развитие широкого спектра умений и навыков у обучаемых на основе использования традиционных и передовых технологий. При этом постоянное совершенствование технических и программных средств компьютерной графики и технологий искусственного интеллекта приводит к возникновению новых возможностей для инноваций и творчества. Большой потенциал использования в учебном процессе имеют искусственные нейронные сети.